# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2023 года*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

## 10 клас
## Варыянт 1

### Заданне 1.

| Словы | Прапушчаныя літары | Словы | Прапушчаныя літары |
|---|---|---|---|
| *Н_ _гарскі вадаспад* | **ія** | *_ _русалім* | **Іе** |
| *ф_ _далізм* | **еа** | *від_ _фільм* | **эа** |
| *мед_ _магнат* | **ыя** | *тр_ _да* | **ыя** |
| *_ _нізацыя* | **іа** | *мел_ _рацыйны* | **ія** |
| *вакальнае тр_ _* | **ыа** | *р_ _білітацыя* | **эа** |
| *аўд_ _візуальны* | **ыя** | *б_ _здольны* | **ая** |
| *_ _зіс* | **аа** | *фіз_ _працэдуры* | **ія** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

### Заданне 2.

А4 Б2 В5 Г1 Д7 Е3

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

### Заданне 3.

| Зыходная форма | Суфікс | Вытворная форма |
|---|---|---|
| *тонкі* | ***-еньк-*** | ***тоненькі*** |
| *тонкі* | ***-ават-*** | ***танкаваты*** |
| *тонкі* | ***-ютк-*** | ***танюткі*** |
| *тонкі* | ***-юсеньк-*** | ***танюсенькі*** |
| *тонкі* | ***-ляв-*** | ***танклявы*** |

*За кожную пару (падабраны суфікс і вытворную форму) – 1 бал.*

### Заданне 4.

А1 Б3 В1 Г2 Д3 Е2

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

### Заданне 5.

| № | Сцверджанне | +/– |
|---|---|---|
| 1 | Тып тэксту – апавяданне з элементамі разважання. | + |
| 2 | Тэкст белетрыстычнага стылю. | – |
| 3 | У апошнім сказе трэба паставіць 7 косак. | + |
| 4 | Слова ***бяднейшы*** – складаная форма вышэйшай ступені параўнання прыметніка *бедны*. | – |
| 5 | У слове ***ра(с,сс)тупіцеся*** пішацца ***сс***: прыстаўка *рас* + корань *-ступ-*. | + |
| 6 | Сінонімы да слова ***светапогляд*** – канцэпцыя, адмаўленне, прынцып, адчуванне, крэда, сузіранне, уяўленне. | – |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| Групы | Нумар трэцяга лішняга сказа | Тлумачэнне |
|---|---|---|
| ***I*** | 1 | У 2 і 3 сказах дадзеныя часткі звязаны з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў *як*, а ў 1 сказе – пры дапамозе злучальнага слова *як*. |
| ***II*** | 1 | У 2 і 3 сказах злучальнае слова выконвае сінтаксічную функцыю дапаўнення, а ў 1 сказе – азначэння. |
| ***III*** | 2 | У 1 і 3 сказах дададная акалічнасная меры і ступені, а ў 2 – дададная акалічнасная спосабу дзеяння. |

*За кожны правільны радок – 2 балы (1 бал за ўказанне нумара трэцяга лішняга сказа і 1 бал за тлумачэнне).*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

– Пачакайце, я сам скажу, што я думаю. Я думаю, што калі б звера, які дрэмле ў чалавеку, можна было спыніць пагрозаю, усё роўна, каталажкі *(турмы)* або замагільнай *(тагасветнай)* адплаты *(кары, пакарання)*, *(най)*вышэйшаю эмблемай чалавецтва быў бы цыркавы ўтаймавальнік з бізуном *(дубцом, плёткай, пугай)*, а не *(сама)*ахвярны прапаведнік *(, які ахвяруе сабою)*. Але ў тым вось *(якраз)* і справа *(ў тым і рэч)*, што чалавека стагоддзямі ўздымала *(ўзнімала, падымала, ўзносіла)* над жывёлай і ўзносіла *(несла)* ўвысь не палка, а музыка: неперамажнасць *(непахіснасць; захаплялььнасць)* бяззбройнай ісціны, прыцягальнасць яе прыкладу.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| Тэрмін | Прыкладнае азначэнне |
|---|---|
| **Анафара** | Паўтор гукаў ці слоў у пачатку вершаванага радка. |
| **Дактыль** | Трохскладовая стапа з націскам на першым складзе. |
| **Метафара** | Перанос уласцівасцей адной з'явы на другую паводле падабенства. |
| **Рыфма** | Сугучнасць канчаткаў вершаваных радкоў. |

*За кожны правільна вызначаны тэрмін – 0,5 бала, за кожнае прынцыпова правільнае (якое перадае сэнс паняцця) азначэнне – 1 бал. Калі тэрмін ўнесены няправільна (нават пры правільным яго азначэнні), то аднімаецца 0,5 бала. Агульная колькасць балаў за заданне – не менш за нуль.*

**Заданне 9.**

| Максім Танк | | Максім Гарэцкі | | Не адносіцца да жыцця і творчасці ні Максіма Танка, ні Максіма Гарэцкага |
|---|---|---|---|---|
| праўдзівы | памылковы | праўдзівы | памылковы | |
| **2** | **6** | **4, 7** | **1** | **3, 5** |

*За кожнае правільнае суаднясенне (несуаднясенне) з жыццём і творчасцю Максіма Танка ці Максіма Гарэцкага – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці/памылковасці фактаў з жыцця і з творчасці песняроў – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Заданне можа быць ацэнена па трох крытэрыях: колькасць выкарыстаных слоў і словазлучэнняў (далей – словы), адпаведнасць прапанаванага тэксту дадзеным тлумачэнням, наяўнасць фактычных памылак.*

| *Колькасць выкарыстаных слоў* | |
|---|---|
| *Колькасць балаў* | *Крытэрыі* |
| 2 | *Выкарыстаны ўсе прапанаваныя словы* |
| 1 | *Выкарыстана не менш за 4 словы* |
| 0 | *Выкарыстана менш за 4 словы* |

| *Адпаведнасць прапанаванага тэксту дадзеным тлумачэнням* | |
|---|---|
| *Колькасць балаў* | *Крытэрыі* |
| 2 | *Прапанаваны тэкст поўнасцю адпавядае адрасату, вытрыманы навуковы (навукова-папулярны) стыль выкладу* |
| 1 | *Прапанаваны тэкст толькі часткова адпавядае заяўленаму адрасату, маюцца нязначныя парушэнні стылёвага характару* |
| 0 | *Прапанаваны тэкст поўнасцю не адпавядае заяўленаму адрасату, тэкст не адпавядае навуковаму (навукова-папулярнаму) стылю* |

| *Наяўнасць фактычных памылак* | |
|---|---|
| *Колькасць балаў* | *Крытэрыі* |
| 2 | *Фактычныя памылкі адсутнічаюць* |
| 1 | *У тэксце маецца не больш за 2 фактычныя памылкі* |
| 0 | *У тэксце маецца больш за 2 фактычныя памылкі* |